**Мы** ганарымся землякамі // Патрыёт (Ушачы). — 2006. — 25 сак. — С. 2.

# МЫ ГАНАРЫМСЯ ЗЕМЛЯКАМІ



Мы, канечне, многа чыталі пра вайну, шмат стужак паглядзелі, ведаем, што такое Вялікая Айчынная, і хто такія воіны-інтэрнацыяналісты. Але нічога не можа замяніць жывыя зносіны і не бывае такім пераканаўчым, як расказ саміх удзельнікаў.

У нашай школе была арганізавана сустрэча адразу з двума інтэрнацыяналістамі. Ігар Віктаравіч Лёля ваяваў у Афганістане, служыў механікам-вадзіцелям баявой разведвальнай машыны ў палку, задачай якога была ахова Баграмскага аэрадрома. Падчас адной з аперацый машына падарвалася, а экіпаж атрымаў раненні. Наогул, за паспяховае выкананне шэрагу аперацый Ігар Віктаравіч узнагароджаны медалём «За адвагу». З цеплынёй расказвае пра сваіх баявых сяброў.

Не ведалі мы, што нашы салдаты служылі нават на Афрыканскім кантыненце, а Уладзімір Уладзіміравіч Клімашэўскі трапіў у Анголу. З фотаздымкаў, якія паказаў ён, пазналі многа цікавага, наогул спрабавалі разабрацца, чаму нашы землякі, беларусы, служылі не на тэрыторыі сваёй Радзімы, а ў іншых краінах. Мы ўдзячны нашым цікавым апавядальнікам за тое, што знайшлі час, прыйшлі да нас.

**Вучні Жарскай школы**